дагаворвае, але мы добра разумеем, што тут у першую чаргу маецца на ўвазе калектывізацыя і раскулачванне. Абяцаючы людзям пазбавіць іх ад калгаснага ярма, гітлераўцам часам, сапраўды, удавалася перацягнуць некаторых на свой бок.

Купалаўскі выраз «раскіданае гняздо» стаў, здаецца, крылатым і можа быць суаднесены з многімі этапамі нашай гісторыі, асабліва з калектывізацыяй. Хочацца, аднак, спадзявацца, што пазбаўленне ад штучна створаных вялікіх «гнёздаў» (калгасаў) не стане нашай чарговай трагедыяй. Мабыць, трэба не разбураць іх бяздумна, а па-гаспадарску пераўтвараць у нешта больш зручнае.

## Спасылкі:

[1] Лойка А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд: Падруч. для філал. фак. ВНУ: У 2 ч. Ч. 2.— Мн., 1989.— С. 193.
[2] Солженицын А. Архипелаг ГУЛАГ: В 3 т. Т. 3. — М., 1989. — С. 19.
[3] Тамсама. Т. 1. — С. 63—64.
[4] Тамсама. — С. 34.
[5] Пажарыцкі М. Народнасць як аснова характару // Беларуская мова і літаратура. — 1999.—№2.— С. 12.
[6] Тут і далей творы В.Быкава цытуюцца паводле выдання: Быкаў В. Збор твораў: У 6 т. — Мн., 1992—1994. У дужках спачатку ўказваецца том, затым — адпаведная старонка.
[7] Пажарыцкі М. Народнасць як аснова характару // Беларуская мова і літаратура. — 1999. — №2. — С. 12.
[8] Солженицын А. Архипелаг ГУЛАГ: В 3 т. Т. 1. — С. 63.
[9] Купала Я. Збор твораў: У 7 т. Т. 6. — Мн., 1975. — С. 339.
[10] Тамсама. — С. 281.
[11] Тамсама. — С. 279.

*І.М.Гоўзіч*
*(Мінск)*

## У РЭЧЫШЧЫ КУПАЛАВЫХ ТРАДЫЦЫЙ: ДА ПРАБЛЕМЫ ЖАНРАВА-СТЫЛЁВАЙ СВОЕАСАБЛІВАСЦІ ПАЭЗІІ ПРАДСТАЎНІКОЎ ФІЛАЛАГІЧНАГА ПАКАЛЕННЯ

Пастаўленая намі праблема ў загалоўку паведамлення шматаспектная. Па-першае, наколькі заканамерная яе пастаноўка ўвогуле: прайшлі дзесяцігоддзі, спадчына Купалы пры ўсёй велічы постаці яе творцы паступова забываецца, новы час нараджае новыя песні і новых куміраў? Па-другое, ці можна праецыраваць творчасць аднаго, няхай сабе і самага слыннага мастака на творчасць цэлага пакалення? Аказваецца, можна. І вось чаму.

На першае пастаўленае пытанне адкажам наступным чынам... Янка Купала ў многіх сваіх рэчах далёка выходзіць за межы часу малога, бо дапаўняе канкрэтнае агульным, сацыяльна-кан'юктурнае, часовае — агульначалавечым. У яго спадчыне («Курган», «Магіла льва», «Сон на кургане», «Адвечная песня», «На куццю», «Перад будучыняй», «Спадчына» і інш.) крынічыць клопат пра Дабро і Зло, час і лёс, святло і змрок, хваляванне і спакой, часовае і вечнае. А паэма «Яна і я» ўяўляе сабой песню ўсіх сваіх вякоў і народаў пра святасць кахання, шчасця, еднасць душ як гарантыю ачалавечвання чалавека. Таму ён вольна праецыруецца на ўсю наступную творчасць. І як бы ні старалася гісторыя памяняць Купалавы набыткі на новыя, яны застаюцца, бо маюць агульначалавечую каштоўнасць. Другое пытанне здымаецца таму, што беларускі пясняр — постаць шматгранная, стыль яго шматаспектны і непаўторны ў арганічна паяднаных складальных частках: імкненне да праўдападобнасці і нават натуралістычнага апісання суровых умоваў жыцця дарэвалюцыйнага сялянства і рамантычная перасатваральнасць у паэмах «Сон на кургане», «Адвечная песня», высокаснасць адычнага пафасу ў творах пра індустрыяльнае будаўніцтва даваеннага перыяду і элегічная жаласлівасць у многіх вершах 1918—1922 гадоў, фальклорная празрыстасць і ўскладненасць, што даходзіць да асацыятыўнай вобразнасці, устаноўка на агульнаўжывальную, усім зразумелую і ўнармаваную лексіку і пастаянная прага новатвораў, выпук малаўжывальных словаў. Падобная шырыня творчай праграмы і дазваляе спраецыраваць яго набыткі на скарбы і набыткі цэлага (у дадзенай сітуацыі — пасляваеннага, філалагічнага) пакалення.

Думаецца, па бунтоўнасці настрою, рамантычнай акрыленасці, калі зрокам хочацца ахапіць не толькі зямлю, але і космас, узняцца ў недасяжныя вышыні (вершы «І вецер, і сокал, і я», «На шляху», начныя элегіі) Янка Купала бліжэйшы Петрусю Макалю (зб. «Дотык да зямлі»). Купалаўская кантраснасць настрою, палярнасць колераў як у лірычных, так і ў паэмных творах па-свойму, яшчэ ў больш рэзкай форме трансфармавалася Анатолем Сербантовічам, многія творы якога — пра святло і змрок, дабро і зло ў іх вечным супроцьстаянні. Хіба не інтанацыю Купалавага «І прыйдзе...» чуем мы ў радках Сербантовічавага верша «Я чую плач. Ён у маіх грудзях...»:

Нас прывядуць на суд часінай той,
Калі не да жыцця без забыцця,

Судзіць
Са справядлівай праматой
І з чэснасцю маленькага дзіця[1].

Рыгор Барадулін — майстар выключна яркага і непаўторнага тропа, цудоўнага слова-новатвора, што адчуваецца нават у назвах яго зборнікаў паэзіі — «Нагбом», «Неруш», «Маўчанне перуна», «Міласэрнасць плахі», «Вяртанне ў першы снег» і інш. А хіба не Купала тое ж самае пачынаў рабіць у сваіх «Паязджанах», у менш вядомых вершах «Як цені», «У чужой старане», «Папросту», «На вялікім свеце...», «Цару неба й зямлі», «Не шукай» і інш.? Гэта ж ён амаль кожны твор упрыгожваў такімі карункамі, як «ні праслыху, ні прагледу», «збеядуха», «злыбядуха», «крывадушшыць не прабавалі», «цёмна, як у дамавіне», «шалясціць, як вяроўкаю кат», «бесхацінец», «А неба каменем маўчыць»... Адкрыем Купалавы творы — і амаль у кожным вершы знойдзем эмацыянальна завостраную міні-вобразнасць, звышэмацыянальныя, надзвычай гаваркія новатворы. Можа, якраз Купала дапамог Барадуліну напісаць — «Маўчанне перуна», бо было ж у яго пранікнёнае і невыносна балючае — «А неба каменем маўчыць»?

Мы пішам (і гэта стала агульнапрызнана і агульнапрынята, як аксіёма) пра прытчападобнасць паэзіі Анатоля Вярцінскага, размоўнасць як вядучую стылявую дамінанту схільнага да эталагічнага пісьма аўтара. Але ж задоўга да яго Купала паказаў, як пісаць творы, НЕПАСРЭДНА ЗВЯРТАЮЧЫСЯ ДА ЧЫТАЧА, нібы раячыся з рэцыпіентам, выклікаючы яго на адкрытае сумоўе. Уся грамадзянская паэзія Купалы была зваротам да пакрыўджаных, гнаных у свеце людзей, да няздольных выпраміцца пад націскам трагедыйных абставінаў. Як у вершы «Як цені»:

Пад непрагляднай марай ночы
Нам не дабачыць нашых крыўд.
На свет падняць баімся вочы,
Сабе сам кожны ўжо абрыд.

А прыгадаем верш «Перад будучыняй» — балючы і страстны, спавядальны і заклікавы ў адначассе. У Вярцінскага таксама арганічна паяднаныя адкрыты зварот да чытача і слухача і балючая спавядальнасць, горкая разважлівасць. Такі сінтэз двух, здаецца, узаемавыключальных стылявых кампанентаў мы бачым у абсалютнай большасці твораў паэта — нашага сучасніка:

Не ведаю, колькі патрэбна вучонасці
для шчасця, для дружбы, для любві.
Ды паспрабуй усё гэта ўяві
без шчодрасці![2]

Вядома, Анатоль Вярцінскі пайшоў далей свайго настаўніка ў перасатварэнні верша класічна-суразмернага, музычнага ў размоўны, зрабіў іншасказальнасць і прытчападобнасць асноўнымі, метадалагічнымі прынцыпамі пісьма. Ды ўсё ж ля вытокаў падобнай паэзіі стаяў ужо ў пачатку XX стагоддзя наш Янка Купала.

Адным з самых таленавітых прадстаўнікоў філалагічнага пакалення ў нашай нацыянальнай літаратуры з'яўляецца Янка Сіпакоў. Мы запісалі яго са з'яўленнем кнігі «Веча славянскіх балад» у майстры гэтага традыцыйнага, старажытнага па часе жанра. А разам з тым ён надзвычай тонкі лірык, пейзажыст у кнігах 60-х і пазнейшых гадоў «Дзень», «Поўдзень, да вады», «Вочы ў вочы» і інш. Як нам думаецца, і Сіпакоў блізкі Купалу ўменнем спалучаць лірычнае пачуццё і размоўнасць, разважлівасць, засяроджвацца на малым, каб прыходзіць да значных філасофскіх вывадаў. Што ж тычыцца баладнай «пераклічкі» двух аўтараў, дык дастаткова прыгадаць рамантычныя паэмы класіка нашай літаратуры «Курган», «Магіла льва», «На куццю», у якіх выразна выяўляецца трагедыйная калізія, не менш трагедыйная канцоўка мае такое ж катарсіснае значэнне, як у баладных творах. А калі гаварыць пра ідэйную пераклічку двух паэтаў, дык яна ў галоўным — адраджэнскім — пафасе таксама надзвычай блізкая. Да прыкладу: ідэя неўміручасці славянскай нацыянальнай прыналежнасці, славянскага (у тым ліку і беларускага) патрыятызму — скразная ў кнізе Сіпакова «Веча славянскіх балад», аднак, так выразна раскрыцца і так магутна загучаць яна не магла б, каб не было да гэтага адраджэнскага пафасу і веры Купалы ў неўміручасць нашага народа, Беларусі, кожнай краіны, народ якой адчуў сябе народам, паверыў у сябе. Асабліва блізкія па духу, пафасу Купалавым вершам «Груган», «На куццю», «Беларускія сыны» і інш. творы Сіпакова «Пытанне. Македонская балада XX стагоддзя», «Мячык. Польская балада XX стагоддзя», беларускія балады «Чубы», «Вяселле». Калі мець на ўвазе адбіццё пэўнай разнавіднасці пафасу ў мастацкай літаратуры, дык ён у многім таксама падобны і ў Купалы, і ў Сіпакова: гэта пафас трагедыйнасці. Адзначым, што, падобна свайму вялікаму папярэдніку, Янка

Сіпакоў любіць словатворчасць, пастаянна перасыпае мастацкія палотны неалагізмамі, нібы стараючыся выкрасліць дадатковы сэнс нашай багатай на адценні лексікі. Надоўга запомніцца ўсім нам, напрыклад, удала знойдзенае паэтам слоўца «крыляць»: крыляць — гэта не проста кружыць над нечым, гэта — лётаць велічна, горда, як бы паказваючыся ўсім у палёце. Выкарыстоўвае Сіпакоў і слова «кружляць», значэнне якога таксама непаўторнае і адметнае: «кружляць» — гэта лётаць, як бы нешта выглядваючы на зямлі, трывожна, «паранена» нейкім болем. Словатворчасць Сіпакова блізкая да словатворчасці яго равесніка і таварыша па філалагічным цэху Рыгора Барадуліна, хоць пра гэта, на жаль, даследчыкі чамусьці не пішуць.

Можа, найбліжэйшым па зместу творчасці да Янкі Купалы з'яўляецца Ніл Гілевіч. І ён — прадстаўнік філалагічнага пакалення літаратараў. Яго таксама, як і яго равеснікаў, апаліла вайна. Па вобразнаму выказванню Сцяпана Гаўрусёва, і ён «вырас пад гарматнымі стваламі». Роднай Лагойшчыне, што пылала ў агні ў суровыя гады вайны, прысвяціў выдатны майстар не адзін твор. Ды найбольш сэрца паэта занепакоена лёсам краіны, што, як і пры Купалу, можа апынуцца без дарогі, згубіць свой шлях у «беспрасвецці», «завеі», не выбавіцца на прасторы свабоднага, незалежнага жыцця. Адраджэнец па духу, Гілевіч прысвяціў сваю грамадскую дзейнасць і мастацкую творчасць апошнім часам праблеме нацыянальнага адраджэння. Пра гэта яго зборнікі 80-90-х гадоў «Святлынь», «На высокім алтары» і іншыя, публіцыстыка. Праз усю творчасць мастака гэтай пары, як і праз усю творчасць яго папярэдніка Купалы, праходзіць клопат пра адраджэнне краіны, адліты ў пранікнёны, афарыстычны радок — «Ці дойдзем мы да Беларусі?». Паміж гэтым радком, агульным настроем паэта (надзвычай трывожным у зборніку «На высокім алтары») і паміж Купалавымі вершамі 1918-1922 гадоў і агульным настроем класіка нашай нацыянальнай літаратуры несумненная, выразная сувязь. Ніл Гілевіч гэта востра адчувае, сведчаннем чаго можа быць і верш у зборніку, прысвечаны памяці Купалы, яго нечаканай і незвычайнай смерці ў Маскве — «Ці дойдзем мы да Купалы?». Грамадзянская лірыка сёння прадстаўлена ў нас годна філалагічным пакаленнем, у якім, у сваю чаргу, лідзіруе Ніл Гілевіч. Лідзіруе заканамерна, бо менавіта ён, як ніхто іншы з яго равеснікаў, адчувае трагізм сітуацыі, у якой апынулася Беларусь у канцы XX — напярэдадні XXI стагоддзя.

Філалагічнае пакаленне літаратараў надзейна трымае эстафету, перададзеную яму геніем нашай літаратуры, прарокам нацыі Янкам Купалам.

**Спасылкі:**

[1] Сербантовіч Анатоль. Жаваранак у зеніце. Вершы. — Мн., 1989. — С. 269.
[2] Вярцінскі Анатоль. Ветрана: Кніга паэзіі. — Мн., 1979. — С. 6.

*А.Э.Астраух*
*(Гродна)*

## КУПАЛАЎСКІ МАТЫЎ ПОШУКУ ПРАВЕДНАСЦІ Ў ПАЭЗІІ Р.БАРАДУЛІНА

Купалава спадчына ўбірае ў сябе Дух і Веру нацыі. Яна — у вялікім міжчассі, знітоўваючы сваёй яваю ў свеце непарыўнасць пакаленняў, прароцтваў. Купала пакутна маліўся *«небу, зямлі і прастору за родны загон Беларусі»*. І ці не ягоная яснабачная вера ў Праведнасць лучыць сённяшніх наступнікаў са светаглядам задумнага Мысляра, асвячае шлях Прарока крывіцкай зямлі.

У беларускай літаратуры адраджэнскі феномен як на пачатку, так і напрыканцы XX стагоддзя выступае як мастацка-эстэтычная дамінанта. Разгадкі прычын нацыянальных *«крыўд і бед»* ахутаны таямнічым арэолам міфалагемы *«забранага краю»*. Менавіта міф як аснова нацыянальнага архетыпу дае магчымасць выразіць нацыянальнае светабачанне, самапазнанне народа на кожным новым вітку яго гісторыі. Беларуская міфалогія (паганская, біблейская) як найбольш старажытны пласт духоўнай спадчыны цесна звязана з філасофіяй жыцця нацыі. Паводле меркавання літаратуразнаўцы В.Каваленкі, «усякая літаратура міфалагізуе, прычым неабходнасць у літаратурнай міфалагізацыі будзе адчувацца датуль, пакуль будзе існаваць літаратура ў сваёй цяперашняй прыродзе»[1].

Паэтычная міфатворчасць Я.Купалы ўтварыла тое сілавое поле, у абсягу якога знаходзіцца і паэзія віднага прадстаўніка філалагічнага пакалення народнага паэта Р.Барадуліна. Зварот «шасцідзесятнікаў» да міфалагічнай мастацкай прасторы абумоўлены выяўленнем свайго «я» ў процівагу ідэалагічным канонам і адчуваннем гаспадарання ў крывіцкім